Беларусь.info

№55 19/05/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Суд над Аляксандрам Казуліным пачнецца 6 ліпеня.** У Маскоўскім судзе Менску вызначыліся з днём пачатку працэсу над Аляксандрам Казуліным, якога трымаюць пад вартай ужо болей за тры месяцы. Тым часам беларускія праваабаронцы выказваюцца за тое, каб экс-кандыдата на прэзыдэнта прызналі ў сьвеце вязьнем сумленьня.

**Фэстываль "Магутны Божа" пазбавілі беларускай мовы**. Увечары 28 чэрвеня ў Магілёве ўрачыста адкрываецца 14-ты міжнародны фэстываль духоўнай музыкі “Магутны Божа”. Сёлетні фэстываль гарадзкія ўлады спалучылі зь сьвяткаваньнем 65-х угодкаў абароны. Упершыню ў гісторыі агітацыйныя матэрыялы фэстывалю выдадзеныя толькі па-расейску.

**Сёньня ў Менску пачынаюцца рэпэтыцыі вайсковага параду да Дня незалежнасьці, які афіцыйна адзначаецца 3 ліпеня.** Апроч ваеннай і сельгастэхнікі, перад усталяванымі на новым праспэкце Машэрава трыбунамі пройдуць фізкультурнікі й актывісты БРСМ, якія пакажуць тэатралізаванае і спартовае шоў. Упершыню ў калёне дэманстрантаў можна будзе заўважыць маладых маці з вазкамі, якія маюць сымбалізаваць стабільную дэмаграфічную сытуацыю ў краіне.

**У Віцебску – вялікая пературбацыя у праваахоўных органах.** Першай “ахвярай” стаў пракурор Акцябрскага раёну Андрэй Ліцвін. Ён сыходзіў на павышэнне — пракурорам Віцебскай вобласці. Але на развітальным банкеце стаўся скандал. У выніку ён не тое, што не атрымаў новую пасаду, але і страціў тую, якую займаў. Яго звольнілі з органаў за дыскрэдытацыю і пазбавілі права на службовую пенсію. З дня на дзень чакаецца адстаўка кіраўніка абласнога Упраўлення Унутраных Спраў Вячаслава Еўстафьефа. Ён, судзячы з усяго, будзе наказаны за “аператыўнасць” — заўчасны рапарт аб расследаванні выбухаў у абласным цэнтры і затрыманне вінаватых.

**Сталіца павольна, але верна набліжаецца да сухога закону.** Спярша забаранілі продаж таннага спіртнога у начных крамах. Нядаўна парк Горкага стаў зонай, свабоднай ад алкаголю. З 16 чэрвеня тут забаронена гандляваць спіртнымі напоямі і півам. У продажу засталіся толькі закускі.

# Асобы

**Чаргінец ініцыюе правядзенне міжнароднага суда над Бушам.** Пасля таго, як сенатара і міліцэйскага пісьменніка не пусцілі ў Амерыку, ён затаіў на Буша страшэнную крыўду. Чаргінец сцвярджае, што яго ініцыятыву падтрымліваюць шматлікія з палітыкаў. У прыватнасці, Уладзімір Жырыноўскі. Месцам правядзення суда прапаноўваецца зрабіць альбо Беларусь, альбо Венесуэлу.

# Абвесткі

**Новы конкурс – «Фота Свабоды».** «Фота Свабоды» – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай “fota Svabody”. Падрабязнасці на www.svaboda.org